УДК 746.5.03(476)

**А.М. Майсяюк**

# Узнікненне і станаўленне бісерапляцення на тэрыторыі Беларусі: да пастаноўкі праблемы

Бісерапляценне і вышыўка бісерам – адзін з найцікавейшых відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. На сённяшні дзень існуе мноства гатункаў бісеру і тэхнік выканання бісерных вырабаў. У сучасным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве акрамя бісеру майстры выкарыстоўваюць разнастайныя яго мадыфікацыі: бісер (дробныя круглыя ці шматгранныя пацеркі з шкла (радзей металу), з адтулінай для нанізвання) [1]; рублены бісер (ці рубка) (кароткія трубачкі ў выглядзе цыліндрыкаў); шклярус (шкляныя цыліндрыкі падоўжанай формы) і пацеркі (буйнейшыя па памерам за бісер і вырабляюцца з розных матэрыялаў: дрэва, пластмасы, камянёў, керамікі). Сучасная беларуская тэрміналогія яшчэ не ўсталявалася, таму ў розных крыніцах сустракаюцца розныя назвы адных і тых жа тэхнік выканання рэчаў з бісеру. Пералічым асноўныя: нізанне, вышыўка, ткацтва, пляценне, вязанне, тэхніка выкладкі па клейкай аснове. Найбольш распаўсюджанымі ва ўсе часы былі тэхнікі нізання (ніткі з набранымі на іх пацеркамі пераплятаюцца між сабой, утвараючы сетку) і шытва бісерам.

Першымі поўнасцю шклянымі вырабамі ва ўсіх народаў былі пацеркі, з'яўленне якіх таксама датуецца па-рознаму – XXVII ст. да н.э. і XXXV ст. да н.э., у сувязі з тым, што дакладнае месца зараджэння шкла таксама невядома. Існуе меркаванне, што вынаходніцтва шкла адбылося не ў канкрэтны гістарычны момант, а ўзнікала ў розныя часы ў розных народаў, калі вытворчыя сілы дасягалі пэўнага ўзроўню развіцця там, дзе для гэтага складаліся спрыяльныя прыродныя ўмовы – менавіта такой думкі прытрымліваецца мастацтвазнаўца М.М. Яніцкая [2].

Пасля вынаходніцтва шкла ў IV тыс. да н.э. яркія, рознакаляровыя шкляныя каралі імгненна пачалі рапаўсюджвацца. Так, даследчыца Н. Лібін адзначае, што першы перыяд росквіту ў мастацтве бісерных упрыгожванняў прыпадае на эпоху мастацтва Эль Амарны, час фараона Эхнатона і царыцы Ніферціці (сярэдзіна II тыс. да н.э.) [3]. Асартымент егіпецкіх караляў і пацерак быў вельмі разнастайны: ад маленькіх рознакаляровых да буйных і фігурных. Цягам часу пацеркі рабілі ўсё меншым памерам – так атрымалі першы бісер. Аднак, у параўнанні з сучасным бісерам, ён быў гіганцкі (0,5–3,5 см). Старажытныя егіпцяне навучыліся выраблядь бісер, вярзці з нітак каралі, нізаць бранзалеты і пакрываць бісернымі сеткамі сукенкі. Егіпецкія пацеркі і бісер былі вядомыя ў многіх краінах свету. Егіпцяне выкарыстоўвалі бісер як прадмет грашовых адносін і менавага гандлю з іншымі краінамі. Так, на тэрыторыі сучаснай Беларусі каля г.п. Юркавічы Веткаўскага р-на Гомельскай вобл. знойдзена егіпецкая блакітная пацерка, якая датуецца 1580–1450 гг. да н.э. [2, с. 11]. Нягледзячы на высокую якасць выкананых у Старажытным Егіпце вырабаў са шкла наўрад правамерна прыпісваць вытворчасць бісеру толькі егіпцянам. Бісерная вытворчасць развівалася не толькі ў Старажытным Егіпце, але і на Старажытным Усходзе, у Індыі, Месапатаміі. Так, даследчык І.Н. Котава мяркуе, што ўскосна гэта пацвярджае і замацаваўшаяся за

дробнымі каралямі са шкла назва «бісер» (ад арабскага «бусер» – «фальшывы жэмчуг») [4].

Першыя звесткі пра выкарыстанне ўпрыгожванняў са шкла на тэрыторыі Старажытнай Русі эпох ранняга і позняга жалезных вякоў былі дадзены В.М. Мельнікоўскай у даследаваннях культуры мілаградскіх плямён; В.П. Пятровым, Э.А. Сымановічам, П.М. Траццяковым, Л.Д. Побалем у даследаваннях культуры зарубінецкіх плямён на тэрыторыі сучаснай паўднёвай і паўднёва-ўсходняй Беларусі. У выніку гэтых даследаванняў былі ўведзены ў навуковы абарот звесткі аб адкрыцці шкляных майстэрань у час жалезнага веку на тэрыторыі ўсходніх праславян: на тэрыторыі сучаснай Беларусі (II–III стст. н.э.) [2, с. 6]. Археалагічныя раскопкі сведчылі, што славянскае насельніцтва таго перыяду шырока карысталася ўпрыгожваннямі са шкла – пацеркамі (VIII–XII стст.), большая частка якіх была знойдзена, галоўным чынам, у курганах каля паселішчаў сельскага тыпу [2, с. 4–5]. Усе тыпы каляровых шкляных пацерак, знойдзеных на тэрыторыі Старажытнай Русі, уключаючы пацеркі знойдзеныя на тэрыторыі сучаснай Беларусі, даследаваліся навукоўцамі М.А. Безбародавым і А.Ул. Фехнер і па саставу шкламасы былі аднесены да тыпова славянскіх упрыгожванняў [2, с. 41–42]. Тэхналогія і характар вытворчасці шкляных вырабаў сведчаць аб тым, што вырабам шкляных пацерак займаліся не толькі кіеўскія рамеснікі, але і майстры іншых буйных эканамічных і палітычных цэнтраў Старажытнай Русі, такіх, як Полацк, Тураў, Навагрудак.

У IX–XII стст. назіраецца працяг развіцця мастацкага шкларобства на тэрыторыі Беларусі, што пацвярджаецца знаходкамі шкляных пацерак і нізак рубленага бісеру на ўсёй тэрыторыі пахаванняў, асабліва на тэрыторыі Гомельскай вобласці, дзе ўпершыню на тэрыторыі сучаснай Беларусі ўзнікла вытворчасць шкла [2, с. 35]. Паводле характару размяшчэння яго ў пахаваннях, існуе меркаванне, што ён выкарыстоўваўся ў якасці аздаблення адзення. У XI–XIII стст. вытворчасць пацерак і бісеру была наладжана ў Мінску, Ваўкавыску, Гродна, Друцку, Мсціславе, Навагрудку, Оршы, Пінску, Полацку, Тураве. А на тэрыторыі Русі развіццё шкларобства на доўгі час было спынена татара-мангольскім нашэсцем (1240 г.).

У X ст. пачынаецца росквіт венецыянскай бісернай вытворчасці, дзе ў XIII ст. складаецца першая цэхавая карпарацыя майстроў-бісершчыкаў, якія падзяліліся на групы ў залежнасці ад вытворчасці таго або іншага віда пацерак. Цягам часу з'явіліся бісершчыкі, якія ў 1604 г. аб'ядналіся з вытворцамі крышталя ў Карпарацыю майстроў-вытворцаў бісеру і каляровых пацерак. Венецыянскі бісер вельмі высока цаніўся і набыў сусветную вядомасць. Пасля адкрыцця Амерыкі і ўстанаўлення марскога шляху ў Індыю шкляныя майстэрні замянілі гуты, якія будаваліся ў XVI–XVII ст. у Іспаніі, Партугаліі, Нідэрландах, Англіі і Францыі. Менавіта ў Францыі ў XVII ст. вынайшлі шклярус – мадыфікацыю бісеру падоўжанай цыліндрычнай формы.

Што тычыцца Беларусі, то на базе традыцый мастацтва XV–XVIII стст. на шкляных мануфактурах рабілі бісер, шклярус і разнастайныя бліскаўкі, якімі потым упрыгожвалася літургічнае адзенне рымска-каталіцкага духавенства. Яскравым прыкладам гэтага з'яўляюцца далматыкі сярэдзіны XVIII ст., вышытыя перламутрам, каляровым шклярусам і металічнымі бліскаўкамі. Таксама да нашых часоў захаваліся некалькі арнатаў XVIII–XIX стст., упрыгожаных бісерам і бліскаўкамі. Шмат увагі шытву і ткацтву надавалася ў манастырах – манахіні ўвесь вольны час адводзілі стварэнню прадметаў для царкоўнага богаслужэння. У XIX ст. ва многіх гарадах Беларусі нараўне з мужчынскімі навучальнымі ўстановамі існавалі жаночыя – пансіёны, дзе абавязкова выкладалася рукадзелле. Сёння немагчыма выявіць месца стварэння большасці вырабаў культавага прызначэння. Але можна выказаць думку, што іх асноўная

частка была зроблена ў манастырскіх майстэрнях, якія славіліся сваім рукадзеллем. Так, вядома, што ў некаторых манастырах выконвалі бісерныя работы толькі для сябе, бо вытворчасць свецкіх рэчаў строга забаранялася. Адметную ролю ў эвалюцыі беларускага бісернага мастацтва адыграла бісернае шытво Веткаўшчыны. Багата вышываныя аправы ікон заўсёды займалі пачэснае месца. Упрыгожваць іконы вышыўкай пачалі яшчэ ў XVII ст., і працягвалася гэтая традыцыя да рэвалюцыі. Для гэтага амаль заўсёды выкарыстоўвалі розныя матэрыялы: жэмчуг, пацеркі, шклярус, фольгу і імітацыі каштоўных каменняў. Акрамя разнастайных царкоўных рэчаў, у розных музеях нашай краіны захоўваюцца рэчы утылітарнага прызначэння: вышытыя сумачкі, пано, нацюрморты і кісеты.

Нягледзячы на цесныя сувязі Беларусі і Расіі, на тэрыторыі Расіі пасля татара-мангольскага нашэсця шкларобства пачало аднаўляцца толькі ў 1635 г. Была адчынена першая руская гута ў сяле Духаніна, пад Масквой, дзе працавалі ўкраінскія майстры. У 1668 г. будуецца другі – Ізмайлаўскі завод, які належаў цару Аляксею Міхайлавічу. Менавіта да гэтага часу адносіцца першая спроба вытворчасці бісеру на тэрыторыі Расіі, якая не мела поспеху. Вялікую ўвагу развіццю шкларобства ў Расіі надаваў Пётр I, які скасаваў падаткі на шкляныя вырабы; для падрыхтоўкі рускіх майстроў запрашаў замежных шкларобаў; адпраўляў за мяжу вучыцца шкляной справе і, у прыватнасці, мастацтву вырабу пацерак. Яшчэ адной няўдалай спробай наладзіць бісерную вытворчасць у Расіі было адкрыццё М.В. Ламаносавым у 1752 г. Усць-Рудзіцкай фабрыкі пад Араніенбаумам, якая выпусціла першую партыю бісеру. Спроба не мела поспеху – пасля смерці вучонага ў 1765 г. фабрыка была зачынена. На працягу XVIII–XIX стст. у Расіі існавалі невялікія казённыя і прыватныя заводы па вырабу разнастайных рэчаў са шкла, але няма ніякіх пасведчанняў аб масавай вытворчасці пацерак. На сённяшні дзень у шматлікіх музеях Расіі захавана вялікая колькасць разнастайных утылітарных рэчаў, адзення, упрыгожанага шклярусам і пацеркамі, а таксама царкоўных рэчаў. Аднак, хутчэй за ўсё, бісер выкарыстаны ў якасці аздаблення быў прывезены ў Расію з Венецыі і Германіі.

У канцы XVIII ст. пачалася вытворчасць караляў і пацерак у Германіі. Шліфавалі бісер у Багеміі (Паўночная Чэхія), дзе здаўна існавала вытворчасць шкла. Тэхніка шкларобства трапіла сюды з суседніх краін. У 1548 г. у гарадку Мшэна-на-Нісе была заснаваная першая гута, а ў 1760 г. у Яблынец-на-Нісе прыбылі першыя замежныя купцы [5]. Асаблівай папулярнасцю чэшскае шкло карысталася ў кан. XVII – пач. XVIII ст. Нараўне з буйнымі вырабамі тут выраблялі каралі, штучныя каштоўныя камяні (стразы), крышталёвы, шкляны бісер і шклярус. Калі венецыянскі бісер выраблялі з каляровага ці эмалевага шкла, то чэшскія майстры пачынаюць выкарыстоўваць розныя спосабы фарбавання. Найвялікшага росквіту бісерная вытворчасць дасягнула ў першай чвэрці XIX ст., калі дзякуючы саперніцтву Венецыі і Чэхіі бісер стаў больш разнастайны і па памерам, і па падборы колераў і адценняў.

У 2-й палове XIX ст. былі зроблены машыны для вырабу пацерак, дзякуючы чаму значна знізілася яго вартасць і ўпрыгожванні сталі даступныя шырокім колам насельніцтва. На змену вертыкальным дыскам для разразання шкляных трубак у 1890 г. прыйшоў вырубны прэс у выглядзе гільяціны, што дало магчымасць апрацоўваць адначасова вялікую колькасць трубачак [5, с. 9]. Гэта спрыяла распаўсюджанню багемскага бісеру ў розных краінах свету. Цэнтры шкларобства ў Цюрынгіі і Францыі не вытрымалі канкурэнцыі з таннай чэшскай прадукцыяй, якая з канца XIX ст. становіцца лідэрам у гэтай галіне. Танны фарбаваны бісер, зроблены пры дапамозе машын, выціснуў таксама і венецыянскі з еўрапейскага рынку.

Гандаль пацеркамі не спыняўся на працягу ўсяго XX ст. Сёння, як і шмат гадоў назад, асноўным пастаўшчыком пацерак у краіны Еўропы і Азіі застаецца

Чэхія. Вядомае супольніцтва «Ябланэкс» экспартуе бісер і разнастайныя ўпрыгожванні з яго ў шматлікія краіны свету. Вытворчасць таннага бісеру наладжана ў Японіі і на Тайвані. Сучасныя мадэльеры выкарыстоўваюць бісер, шклярус, пацеркі не толькі для ўпрыгожвання адзежы, але і вытворчасці аксесуараў. Сучасныя дызайнеры асвойваюць новыя матэрыялы, вынаходзяць тэхналогіі, але ў пошуках дасканаласці ўсё часцей звяртаюцца да мінулага.

У апошнія дзесяцігоддзі народныя промыслы адраджаюцца і пачынаюць уваходзіць у нашае жыццё. Пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў створана навукова-творчая лабараторыя беларускага народнага і сцэнічнага касцюма, дзе выпускнікі універсітэта пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Л.У. Дамнянковай упрыгожваюць бісерам і шклярусам сцэнічныя касцюмы для студэнтаў-выканаўцаў свайго універсітэта. На сучасным этапе развіцця беларускага бісернага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сярод работ майстроў бісерапляцення і вышыўкі бісерам даволі часта сустракаюцца як разнастайныя утылітарныя рэчы, так і рэчы культавага прызначэння. Пры некаторых манастырах існуюць майстэрні, дзе ствараюцца непаўторныя бісерныя шэдэўры. Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца майстэрня Свята-Елісавецінскага манастыра ў Навінках. Цікавыя па выглядзе ўпрыгажэнні, бісерныя яйкі і іконы ствараюць мастакі Саюза народных майстроў Беларусі: А.Г. Артынская, І.У. Кірыкава, А.М. Яраш, Е.У. Едэмская. Вялікая колькасць зацікаўленых людзей наведвае гурткі і курсы вышыўкі, бісерапляцення ў розных гарадах Беларусі. У гэтым прасочваецца непарыўная сувязь духоўных традыцый мінулых часоў.

Такім чынам, можна зрабіць наступны вывад: усе бісерныя вырабы падзяляюцца на тры ўмоўныя віды. Па-першае, бісер выкарыстоўваўся для ўпрыгожвання адзення і розных прадметаў убірання. Па-другое – гэта вялікая колькасць разнастайных утылітарных рэчаў і прадметаў дэкаратыўнага ўбірання інтэр'еру. І нарэшце, трэцюю частку складаюць шматлікія вырабы, якія прызначаліся для царкоўнага ўжытку. Шклароба на тэрыторыі Беларусі цалкам паўтарыла сусветнае развіццё шкловытворчасці. Тэхніка выканання і арнаментыка бісерных вырабаў у значнай меры падпарадкоўвалася традыцыйным законам. Нягледзячы на тыповую «старажытнарускасць» беларускай вышыўкі бісерам, улічваючы цяснейшыя сувязі Беларусі з Кіеўскай Руссю, Візантыяй, Заходняй Еўропай на працягу шматлікіх стагоддзяў, беларускае бісернае мастацтва, пры наяўнасці некаторых тыпова агульных рыс, захавала сваю самабытнасць. Дзякуючы сваёй эстэтычнай прыродзе, бісерапляценне прадстаўляецца як адзін з перспектыўных накірункаў у развіцці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі***: у 5 т. – Т. 1. Акапэла – Габелен, рэдкал.: ***І.П. Шамякін*** (гал. рэд.) і інш. – Мн., 1984. – С. 450–451.
2. ***Яніцкая М.М.*** Вытокі шклароба Беларусі. – Мн., 1980. – С. 3.
3. ***Либин Н.*** Бисер и челночное плетение // Декоративное искусство СССР, 1988, № 8. – С. 32.
4. ***Котова И.Н., Котова А.С.*** Школа современного бисероплетения. – СПб., 1999. – С. 4.
5. ***Бисерное рукоделие***: [Сб.] / Авт.-сост. ***О.Г. Жукова***. – М., 2004. – С. 8.


## *SUMMARY*


*In the article the author considers the evolution of Belarusian glass beads weaving. The glass manufacture is rooted in the ancient tradition coming from ancient Egypt and Venice.*



*Поступила в редакцию 12.10.2005*